1. *Шарден П. де Тейяр.* Феномен человека. – М.: Наука, 1987. – С.37.

2. *Колас Якуб.* Новая зямля. Апавяданні. – Мн.: ГА БТ “Кніга”, 2002. – С.468.

**А.І.Марэцкі,** *прафесар*

# ІДЭАЛОГІЯ І ПРАБЛЕМА КАШТОЎНАСЦЕЙ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Новая філасофская энцыклапедыя дае наступнае азначэнне ідэалогіі: “Идеология – это система концептуально оформленных представлений и идей, которая выражает интересы, мировоззрение и идеалы различных субъектов политики, классов, наций, общества, политических партий, общественных движений” [5]. Ідэалогія цесна звязана з існуючым спосабам жыцця, фарміруецца ў канкрэтных умовах і тэарэтычна афармляецца з улікам гістарычнага часу і нацыянальных традыцый.

Структурнымі элементамі ідэалогіі з’яўляюцца палітычная тэорыя і ідэі, сацыяльна-палітычныя ідэалы, каштоўнасці, палітычныя праграмы, сімвалы. У адрозненне ад эканамічных законаў, якія складваюцца незалежна ад грамадскай свядомасці, заканамернасці ідэалагічнага развіцця фарміруюцца і дзейнічаюць, калі праходзяць праз грамадскую свядомасць людзей. Таму важна ўлічваць дыялектычную ўзаемасувязь ідэалогіі, грамадскай псіхалогіі і грамадскай свядомасці. Толькі ў гэтым выпадку ідэалогія будзе выконваць выхаваўчую функцыю. Небяспечна, калі ў грамадскую свядомасць укараняецца культ грошай, калі чалавека арыентуюць на непрацоўнае жыццё, на набыццё багацця любым шляхам. Менавіта таму такія паняцці, як дабро, сумленнасць, прыстойнасць, сэнс жыцця, сёння вылучаюцца на першы план ў фарміраванні ідэалогіі беларускай дзяржавы.

Сучасны этап развіцця грамадства дапускае прадукцыйную мабілізацыю інтэлектуальных, творчых сіл, накіраваных на фарміраванне і развіццё духоўнай культуры моладзі. У XXI ст., як і раней, выключнае значэнне маюць праблемы жыццёва важных каштоўнасцей насельніцтва, асабліва моладзі. Гэта праблема заўсёды хвалявала грамадства. Асобныя яе аспекты разглядаліся ў працах М.І.Пірагова, К.Д.Ушынскага, І.А.Ільіна і інш. Так, К.Д.Ушынскі лічыў, што падрастаючае пакаленне неабходна выхоўваць такім чынам, каб асноўная задача ўзнаўлення духоўнага патэнцыялу нацыі вырашалася паспяхова. Станаўленне сістэмы каштоўнасных арыентацый у той ці іншай ступені праходзіць на працягу ўсяго жыццёвага шляху, але важнейшы з гэтых этапаў прыпадае на вучобу ў ВНУ.

Як вядома, галоўнай задачай вышэйшай школы з'яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія валодаюць каштоўнасцямі, у тым ліку і ідэалагічнымі. Праблема каштоўнасцей і каштоўнасных арыентацый работнікаў сферы культуры з'яўляецца цэнтральнай пры абмеркаванні пытанняў маралі нашага грамадства. Ад іх прафесіяналізму і ўзроўню культуры ў многім залежыць фарміраванне духоўна багатай асобы.

Сутнасць работы педагога, работніка культуры заключаецца ў тым, каб дапамагчы маладому чалавеку ўвайсці ў свет прыроды і грамадства, у свет прыгожага, пазнаёміць яго з матэрыяльнай і духоўнай культурай гэтага грамадства. Ад каштоўнасных арыентацый педагога ў многім залежаць адносіны моладзі да навакольнага свету.

Падкрэслім, што асабістыя прафесійныя каштоўнасці ўяўляюць пэўную форму ўзаемасувязі асобы з канкрэтнай прафесіяй і адлюстроўваюць разуменне асобай грамадскай значнасці прафесійнай дзейнасці, патрэбнасць у рэалізацыі сваіх чаканняў у дадзенай прафесійнай дзейнасці.

Каб выявіць прывабныя і непрывабныя бакі прафесіі студэнтаў завочнай формы навучання, мы правялі эксперымент

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сярод студэнтаў IV курса факультэта завочнага навучання, у якім прынялі ўдзел каля 400 чалавек. Аналіз прывабных і непрывабных бакоў дзейнасці работнікаў культуры і педагогаў у ацэнцы студэнтаў паказаў вялікі дыяпазон каштоўнасцей, на якія арыентуецца моладзь пры выбары прафесіі работніка культуры.

*Прывабныя бакі*

1. Работа звязана з людзьмі, частыя сувязі з дзецьмі.
2. Добрая зарплата (у ідэале).
3. Удзячнасць дзяцей, бацькоў.
4. Высокі інтэлектуальны патэнцыял.
5. Дынамічны характар прафесіі.
6. Веданне псіхалогіі дзяцей, моладзі, уменне наладзіць з імі кантакт.
7. Адносна вялікі водпуск.
8. Камфортнасць умоў працы.

*Непрывабныя бакі*

1. Невысокая зарплата.
2. Трата сіл, часу са стратамі сваёй сям'і.
3. Цяжкасці ў забеспячэнні жыллём.
4. Канфлікты з калегамі, бацькамі.
5. Вялікая нервовая нагрузка.
6. "Цяжкія дзеці", незацікаўленасць дзяцей у ведах.
7. Пастаянная работа з дакументацыяй.
8. Невысокі прэстыж прафесіі.

Як бачна, для студэнтаў важная рэалізацыя патрэбнасці ў зносінах, выхаванні дзяцей, выкарыстанні набытых ведаў у працэсе работы. Мае значэнне і матэрыяльны бок прафесіі – павелічэнне зарплаты і вялікі водпуск для педагогаў.

Па нашым меркаванні, важнай перадумовай для ўзнікнення прафесійных каштоўнасцей з'яўляецца асабісты погляд на значнасць прафесіі і сувязь з сацыяльным асяроддзем, што з'яўляецца своеасаблівай матывацыяй прафесійнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З вучэбнай дзейнасцю непасрэдна звязаны і выхаваўчы працэс у ВНУ. Асабліва гэта сувязь праяўляецца пры вывучэнні студэнтамі гуманітарных навук. У працэсе іх выкладання высвятляецца, што студэнты ў сваёй большасці не толькі мала знаёмыя з рознымі напрамкамі ідэалогіі, навуковых традыцый і мастацкіх кірункаў, але і не маюць глыбока сфарміраваных поглядаў і перакананняў. Акрамя таго, на жаль, даводзіцца канстатаваць і адсутнасць ва ўяўленнях многіх маладых людзей навуковай карціны свету як асновы светапогляду. Пры яе фарміраванні важна знайсці разумны кампраміс паміж імкненнем забяспечыць моладзь неабходным наборам прыкладных ведаў і жаданнем сфармуляваць у іх цэласную карціну, заснаваную на пачуццёва-эмацыянальным успрыманні навакольнага свету. Пры гэтым, як адзначаў рускі філосаф У.С.Салаўёў, ад таго, якімі могуць быць каштоўнасныя імператывы, што ляжаць у аснове светапогляду чалавека, у многім залежыць індывідуальны выбар асобы, здольны ў канчатковым выпадку аказаць уплыў на кірунак развіцця ўсяго грамадства ў наступным тысячагоддзі.

Таму ў выкладанні гуманітарных навук трэба, па-першае, стымуляванне самастойных думак па самых розных праблемах рэлігійнай, філасофскай, навуковай і мастацкай культуры; па-другое, вельмі плённым і творчым уяўляецца ў працэсе выхавання прасочванне думак і вераванняў агульначалавечага зместу, розных сістэм; па-трэцяе, выкладчык павінен быць гатовым да канструктыўнага дыялога са студэнтамі; па-чацвёртае, ён павінен стварыць умовы для эмацыянальнага ўспрымання разглядаемага матэрыялу. Справа ў тым, што ў навучальным працэсе вышэйшай школы пераважае рацыянальны бок над пачуццёвым. Таму адным з напрамкаў яго ўдасканалення з'яўляецца стварэнне ўмоў для эмацыянальнага задавальнення студэнтаў не толькі зместам вывучаемага матэрыялу, але і ўменнем яго выкласці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз станаўлення прафесійных каштоўнасцей дазваляе вылучыць тыя з іх, якія падаюцца ў аксіялогіі як агульначалавечыя. У сістэме прафесійных арыентацый студэнтаў у сферы адукацыі і культуры можна вылучыць каштоўнасныя арыентацыі , звязаныя:

– з замацаваннем у грамадстве;
– з задавальненнем у зносінах;
– з самавыяўленнем;
– з прагматычнымі запытамі.

Эфектыўнасць засваення студэнтамі прафесійных ведаў, фарміраванне прафесійных уменняў і навыкаў як працэсуальнай асновы іх каштоўнасных арыентацый павышаюцца пры такой арганізацыі навучальнага працэсу, калі:

а) у змесце вучэбных дысцыплін выдзелена сістэма прафесійных ведаў, якія становяцца прадметам асэнсавання і ацэнкі;

б) студэнты маюць актыўную творчую пазіцыю. Яны не толькі выкарыстоўваюць інфармацыю, але і ўдзельнічаюць у прадукцыйнай дзейнасці па распрацоўцы асноўных паняццяў;

в) навучанне ажыццяўляецца не толькі праз тэарэтычнае абагульненне існуючых у студэнтаў ведаў, уяўленняў, але і ўключэнне іх у канкрэтную дзейнасць.

Пералічаныя ўмовы забяспечваюць адзінства рацыянальных і эмацыянальных механізмаў засваення ведаў і ўменняў, ствараюць перадумовы для разгортвання асноўных этапаў фарміравання прафесійных каштоўнасных арыентацый: засваенне прафесійна значымых каштоўнасцей, асабістае прыняцце іх, ператварэнне асобы ў носьбіта дадзеных каштоўнасцей.


1. *Воспитательные* возможности современного вуза: сб. материалов Респ. науч.-метод. конф. – Витебск, 2001.

2. *Жук А.I.* Ідэалагічная работа ў ВНУ: асноўныя напрамкі ўдасканальвання // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – №5.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Мельник В.А.* Государственная идеология Республики Беларусь. Концептуальные основы. – Мн.: Тесей, 2003.

4. *Молодёжь* Беларуси на современном этапе: состояние, проблемы и пути их решения. – Мн., 2004.

5. *Новая* философская энциклопедия. – М., 2001. – Т.2.

6. *Яскевич Я.С.* Основы идеологии белорусского государства: мировоззренческие ценности и стратегические приоритеты. – Мн.: РИВШ БГУ, 2003.

**Ю.У. Міцкевіч**, *выкладчык*

## ВЫХАВАННЕ АСОБАСНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў СТУДЭНТАЎ ЯК БУДУЧЫХ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Асобасная культура з'яўляецца вызначальнай часткай культуры чалавека. У сучасных умовах канкурэнтаздольнасць маладых спецыялістаў на рынку вакансій значна павышаецца, калі яны мэтанакіравана займаюцца фарміраваннем асобаснай культуры.

Сёння студэнты разумеюць, што неабходна атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі не толькі дзеля фармальнасці, а каб на самай справе мець рэальную магчымасць працаваць па выбранай спецыяльнасці.

Аналіз перыядычных друкаваных выданняў сведчыць, што прафесійная гатоўнасць спецыялістаў да выканання непасрэдных абавязкаў вызначаецца шэрагам параметраў. Сярод дамінантных – належны комплекс ведаў, уменняўў, навыкаў, вопыт работы, пазітыўныя асобасныя і прафесійныя якасці.

Вынікі нашага апытання сярод практыкаў-менеджэраў, кіраўнікоў арганізацый дазваляюць сцвярджаць, што пры першай сустрэчы з патэнцыяльным кандыдатам на вакантную пасаду звяртаецца ўвага, акрамя пералічанага вышэй, на асобасную культуру спецыяліста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ